3. Бельскі, А. Вечныя імгненні хараства, або Паэт, які кахае / А. Бельскі // Крыніца. – 2001. – № 7. – С. 47–52.
4. Дранько-Майсюк, Л. Акропаль : паэзія, эсэ / Л. Дранько-Майсюк. – Мінск, 1994.

*Іофе Э.Р. (Мінск)*

## Максім Багдановіч як гісторык беларускай культуры

У апошнія гады выдадзены шэраг цікавых работ аб жыцці і дзейнасці класіка беларускай літаратуры М. Багдановіча, сярод іх – энцыклапедыя «Максім Багдановіч». Разам з тым, «белай плямай» застаецца тэма «М. Багдановіч як гісторык беларускай культуры».

Хутчэй за ўсё, М. Багдановіч быў добра знаёмы з працамі У. Пічэты «Літоўска-польскія ўніі і адносіны да іх літоўска-рускай шляхты», «Літоўска-руская дзяржава». «Гедымін», «Гістарычны нарыс славянства», «Драма балгарскага народа», «Гістарычны лёс Сербіі» і інш., з яго рэцэнзіямі на кнігі па гісторыі Заходняй Русі.

На вечары памяці М. Багдановіча, які адбыўся ў БДУ 3 снежня 1922 г., У.І. Пічэта ва ўступным слове згадаў, што сем год назад, калі ён працаваў яшчэ ў Маскоўскім універсітэце (*на самой справе, у Практычнай Акадэміі камерцыйных навук. – Э. І.*), да яго звярнуўся малады студэнт, просячы дапамагчы ў распаўсюджванні сярод маскоўскіх беларусаў і прагрэсіўнага маскоўскага грамадзянства ідэі аб падтрымцы культурна-нацыянальнага руху на Беларусі. Гэтым маладым студэнтам быў М. Багдановіч [4].

У чэрвені 1923 г. (праз шэсць з паловай месяцаў пасля папярэдняга выступлення), таксама на вечары памяці М. Багдановіча, У.І. Пічэта ўдакладніў: «У снежні 1915 года ў маёй кватэры зазваніў званок. Я адчыніў дзверы і ўбачыў маладога студэнта. Гэта быў Максім Багдановіч – студэнт Яраслаўскага юрыдычнага ліцэя. Ён звярнуўся да мяне з просьбай аб дапамозе ў вывучэнні гісторыі роднага краю <...> Ён быў прадстаўніком тых, на сцягу якіх было напісана: адраджэнне нацыянальных культур...» [5].

Напярэдадні Першай сусветнай вайны і сустрэчы з расійскім гісторыкам М. Багдановіч напісаў артыкул «Белорусское возрождение». Ён быў надрукаваны ў № 1, 2 часопіса «Украинская жизнь» за 1915 г.,

які выходзіў у той час у Маскве на рускай мове. Вельмі важна, што ў гэтым даследаванні М. Багдановіч даў перыядызацыю нацыянальна-вызваленчага руху на Беларусі на працягу XIX – пачатку XX стст. На яго думку, дарэформенны этап звязаны з ростам антыпрыгонніцкіх настрояў сярод часткі мясцовай шляхты і ажыўленнем лакальнага, «краёвага» патрыятызму, зараджэннем пераважна ў асяроддзі спаланізаванай інтэлігенцыі новай беларускай літаратуры (Я. Баршчэўскі, Я. Чачот, У. Сыракомля, А. Кіркор, А. Вярыга-Дарэўскі, В. Дунін-Марцінкевіч). Парэформенны этап (пачатак 1860-х–1890-я гг.) пазначаны сацыяльна-палітычным выбухам падчас паўстання 1863–1864 гг., з'яўленнем беларускага нелегальнага друку («Мужыцкая праўда» К. Каліноўскага), зараджэннем народніцка-сацыялістычнага руху (група «Гоман»), паглыбленнем навуковага вывучэння Беларусі, творчасцю Ф. Багушэвіча, які «едва лн не первым явился проповедннком всестороннего нацнонального возрождения белорусов, доказывая, что онн представляют отдельный, самостоятельный народ» [1, с. 273].

Уражвае манера доказу М. Багдановічам свайго пункту погляду. Ён адзначае, што да канца XIII ст. беларуская народнасць у сваіх асноўных рысах ужо сфарміравалася, апярэдзіўшы ў гэтых адносінах народнасць велікарускую, якая, такім чынам, не магла аказваць уплыў на працэс узнікнення беларусаў. М. Багдановіч акцэнтуе ўвагу на тое, што адсутнасць эканамічных сувязей, геаграфічныя ўмовы, якія ізалявалі Беларусь ад паўночна-ўсходніх зямель, – усё гэта пакідала яшчэ менш месца для якога-небудзь узаемадзеяння. Нарэшце, лічыць даследчык, у тым жа XIII ст. беларусы і велікарусы падышлі да дзяржаўнага раздарожжа, што яшчэ больш адасобіла іх. Беларусь цалкам аказалася ў межах Вялікага Княства Літоўскага, а велікарускія вобласці згрупаваліся вакол Масквы. З гэтага часу, падкрэслівае М. Багдановіч, жыццё абодвух народаў, як і іх гістарычны лёс, надоўга страчвае ўсякую агульнасць.

Рэцэнзія У.І. Пічэты на работу М. Багдановіча з'явілася толькі ў 1922 г. Пад назвай «М. Багдановіч як гісторык Беларускага адраджэньня» яна была апублікавана ў № 5, 6 часопіса «Весьнік Нар. Ком. Асьв. С.Р.Р.Б.». У сувязі з гэтым паўстае пытанне: «Чаму не адразу была напісана рэцэнзія, а толькі праз сем год?». Сёння цяжка адка-

заць на яго. Не трэба забываць, што ў той час ішла Першая сусветная вайна, калі друкавацца было не так проста. Затым пайшлі бурныя падзеі 1917 г., грамадзянская вайна... Ёсць пэўныя падставы меркаваць, што праца У.І. Пічэты рэктарам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, выкладанне гісторыі Беларусі ў гэтай навучальнай установе аказалі ўплыў на яго імкненне паглыблена заняцца вывучэннем гісторыі беларускай культуры. І адным з першых крокаў стала вывучэнне творчай спадчыны М. Багдановіча, якога Уладзімір Іванавіч ведаў асабіста.

Рэцэнзія У.І. Пічэты на артыкул М. Багдановіча да сённяшняга часу не страціла сваёй навуковай каштоўнасці і актуальнасці. Адразу трэба адзначыць, што гэта не толькі рэцэнзія на вышэйзгаданы артыкул, але і крытычны разгляд шэрагу гістарычных і публіцыстычных работ беларускага аўтара. Аб гэтым сведчаць наступныя словы У.І. Пічэты: «Максім Багдановіч быў верным рыцарам сваёй абяздоленай бацькаўшчыны, і толькі адным сваім мастацкім словам: ён выступаў і як публіцыст, які ў сваіх сьцісла напісаных артыкулах імкнуўся паказаць гісторыка-культурныя асновы беларускага нацыянальна-культурнага адраджэньня. І яго артыкулы, напісаныя без усякай палітычнай прадузятасці, з належачым маладому пісьменніку прыгожствам, сведчаць сваёй аўтарытэтнасьцю аб рэальнасьці нацыянальных імкненьняў беларускага народу» [3, с. 8–9].

На падставе глыбокага аналізу работ М. Багдановіча па гісторыі беларускай культуры У.І. Пічэта прыходзіць да высновы, што, нягледзячы на суб'ектывізм асобных палажэнняў аўтара, агульны нарыс беларускага нацыянальна-культурнага адраджэння прадстаўлены зусім выразна. На яго думку, шчырая абарона М. Багдановічам беларускай культуры апраўдана сучасным жыццём і існаваннем нацыянальнай беларускай культуры.

На пасадзе рэктара Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1921–1929 гг.) У.І. Пічэта надаваў вялікую ўвагу прапагандзе і папулярызацыі беларускай культуры, у сувязі з чым прафесар БДУ М.М. Піятуховіч успамінаў: «Вялікую ролю ў прапагандзе беларускай мовы адыгралі праводзіўшыяся па ініцыятыве рэктара У.І. Пічэты ўрачыстыя сходы, якія прысвячаліся асобным паэтам і пісьменнікам (Янку Купале, Якубу Коласу, Максіму Багдановічу і інш.). На сходах

рабіліся даклады аб творчасці пісьменнікаў; звычайна, на іх збіралася шмат слухачоў; зала не магла ўмясціць усіх жадаючых; даклады праходзілі з вялікім уздымам і мелі велізарнае значэнне» [2, с. 59].

Хацелася б адзначыць памылку, якую дапускаюць даследчыкі жыцця і дзейнасці як М. Багдановіча, так і У. Пічэты, сцвярджаючы, што ў БДУ ў 1920-я гг. адбыўся толькі адзін вечар памяці аўтара «Вянка». На самой справе адбылося два вечары. Першы, як ужо адзначалася, – 3 снежня 1922 г. У ім прынялі ўдзел рэктар БДУ прафесар У.І. Пічэта, лектар М.М. Піятуховіч, старшыня Цэнтрабелсаюза Я.Л. Дыла і беларускі драматург У. Галубок. На гэтым пасяджэнні рэктар БДУ выступіў з уступным словам і зрабіў асобны даклад, у пачатку якога акцэнтаваў увагу на тым, што М. Багдановіч у якасці публіцыста мае велізарнае значэнне ў гісторыі беларускага нацыянальна-культурнага адраджэння. У.І. Пічэта заўважыў, што сваімі артыкуламі, якія друкаваліся ў розных расійскіх часопісах і газетах, паэт стараўся пазнаёміць з беларускім нацыянальным рухам, вызначыць яго месца ў гісторыі еўрапейскіх нацыянальных рухаў, еўрапейскай культуры, якая ідзе ў сваім развіцці ад адзінай сярэдневяковай культуры да шматлікіх нацыянальных культур. Дакладчык падкрэсліў, што беларуская культура мае права на самастойнае існаванне, што яе гістарычны шлях шмат чым адрозніваецца ад культуры расійскай, што блізкасць да Заходняй Еўропы дала беларускай культуры «асобны характар і адзнаку».

Другі вечар памяці М. Багдановіча (сярэдзіна чэрвеня 1923 г.) быў адкрыты пад гукі Інтэрнацыянала старшынёй Інстытута беларускай культуры С.М. Некрашэвічам. Ён азнаёміў прысутных з кароткім жыццём выдатнага паэта і заклікаў усіх вітаць прысутнага на вечары бацьку паэта Адама Ягоравіча. Уся зала сустрэла яго бурнай авацыяй. З аглядам навуковай дзейнасці М. Багдановіча зноў выступіў рэктар БДУ прафесар У.І. Пічэта. На яго думку, М. Багдановіч вылучыў галоўныя моманты ўпадку і росквіту ў гісторыі культурна-нацыянальнага руху Беларусі, што мела месца ў многіх народаў, падкрэсліў замену беларусафільства беларусазнаўствам. Першае месца ў беларусазнаўстве У.І. Пічэта адвёў М. Багдановічу, бо менавіта ён даў схему культурна-нацыянальнага адраджэння, выявіўшы добрае разуменне гістарычнага працэсу. Даклад прафесар закончыў такімі словамі: «Ён памёр, не даўшы прастору магутным крылам. Каб

жыў у сучасиы момант М. Багдаовіч, ёи быў бы ў ліку тых беларусаў, якія чытаюць лекцыі з катэдраў БДУ» [5].

У.І. Пічэта перажыў М. Багдановіча на 30 год. Ёи стаў вучоным-славістам з сусветным імем, адным з самых вядомых і выдатных савецкіх вучоных-гуманітарыяў, арыгінальным гісторыкам беларускай культуры, якога па праве называлі «гісторыкам-аиалітыкам», першым і адзіиым заслужаным прафесарам БССР. Па гэтай прычыие такой важнай з'яўляецца яго ацэнка творчай спадчыииы выдатиага беларускага паэта Максіма Багдановіча.

**Літаратура**


1. Багдановіч, М. Збор твораў : у 2 т. / М. Багдановіч. – Мінск, 1968. – Т. 2.
2. Беларускі дзяржаўны універсітэт (1921–1927). – Мінск, 1927.
3. Пічэта, У. М. Багдановіч, як гісторык Беларускага адраджэньня / У. Пічэта // Весьнік Нар. Ком. Асьв. С.Р.Р.Б. – 1922. – Вып. 5–6.
4. Савецкая Беларусь. – 1922. – 6 снеж.
5. Савецкая Беларусь. – 1923. – 20 чэрв.


*Ісмаілава А.А. гызы (Баку, Азербайджан)*

## Формироваиие лиигвокультурологической компетеиции учащихся азербайджанской школы иа материале русского художествениого текста

За годы учёбы школьник должеи не только получить некую (обозначенную государствеииыми стаидартами и программами) сумму знаний и подготовиться к взрослой жизии (в том числе, как принято считать, и за счёт этих знаний), но и «догнать человечество в его культурном развитии, «обжить» дом культуры как родной дом и создать себя по закоиам культуры» [1, с. 8]. Прежняя «знаниецентрическая» школа видела в учеиике прежде всего обучаемый объект, а не личность со свойственной ей внешней и внутренией свободой. Такой подход не соответствует современной социокультурной ситуации: путь усвоения суммы зианий (которые, как утверждают учёные, устаревают быстрее, чем завершается цикл обучения в школе) приводит лишь к накоплению информации, превращает ученика в «справоч-